Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”

Репозиторий ВГУ

**Т.А. Грачыха**

# АСНОВЫ ТЭРМІНАЗНАЎСТВА

Вучэбна-метадычныя матэрыялы

Віцебск
2012

**Вучэбная праграма**
**“Асновы тэрміназнаўства”,**
зацверджаная Навукова-метадычным саветам УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” 25. 04. 2008, рэгістрацыйны № УД-09 004.

**Тлумачальная запіска**

Тэрміналагічная праца ажыццяўляецца ў апошнія дзесяцігоддзі ў шырокіх маштабах. Развіццё навукі і тэхнікі прыводзіць да ўзнікнення новых прадметаў, аб’ектаў, паняццяў, з’яў. У сучасную эпоху інфармацыі з’яўленне новых тэхналогій, камп’ютарызацыя гаспадаркі вядуць да актывізацыі інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў і да ўтварэння новых паняційна-тэрміналагічных сістэм. Даследаванне тэарэтычных і практычных праблем упарадкавання навуковай тэрміналогіі набывае ва ўмовах сучаснага навукова-тэхнічнага прагрэсу асаблівую актуальнасць. Неабходнасць глыбокага вывучэння праблем тэрміна і тэрміналогій прадыктаванне патрабаваннямі сучасных навукова-тэхнічных зносін. Тэрміналогія – падсістэма лексікі літаратурнай мовы, якая актыўна развіваецца ў наш час, паколькі забяспечвае сучасныя інфармацыйна-камунікатыўныя працэсы ва ўмовах навукова-тэхнічнага прагрэсу. Ва ўсіх высокаразвітых мовах свету назіраецца з’ява актыўнай аўтанамізацыі спецыяльнай лексікі, ідзе працэс распрацоўкі тэрміналагічнай тэорыі. Гэта прывяло да ўзнікнення новай навуковай дысцыпліны – тэрміназнаўства, аб’ектам якога з’яўляецца тэрмін, яго семантычная і граматычная арганізацыя, роля ў камунікатыўных працэсах. У сувязі з гэтым вывучэнне асноў дадзенай дысцыпліны з’яўляецца адным з важнейшых элементаў лінгвістычнай адукацыі студэнтаў-філолагаў. Неабходнасць вывучэння і ўпарадкавання беларускай тэрміналогіі ўзмацняецца недастатковай даследаванасцю заканамернасцей яе фарміравання і функцыянавання.

Тэрміназнаўства звязана з рознымі раздзеламі моваведства: лексікалогіяй, семіётыкай, граматыкай, гісторыяй мовы, сацыялінгвістыкай. Яно звязана і з нелінгвістычнымі навуковымі дысцыплінамі: інфарматыкай, матэматыкай, логікай, псіхалогіяй, сацыялогіяй, канкрэтнымі галінамі навукі і тэхнікі. Тэрміназнаўства вывучае план выражэння тэрмінаў (граматычную арганізацыю і законы функцыянавання), а таксама іх семантычную структуру, якая з’яўляецца планам зместу тэрмінаў як носьбітаў спецыяльных прафесійных паняццяў. Усё гэта дазваляе гаварыць пра комплексны, міждысцыплінарны характар тэрміназнаўства.

Мэта дысцыпліны – пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі, структурай і праблемамі сучаснай тэрміналогіі як навуковага кірунку, паказаць ролю і месца тэрміналогіі ў розных камунікатыўных працэсах, выявіць уласна лінгвістычныя асаблівасці і заканамернасці развіцця сучаснай беларускай тэрміналогіі ў аспекце яе фарміравання і ўпарадкавання, у структурна-семантычным і словаўтваральным аспектах.

Задачамі выкладання дадзенага курса з’яўляюцца наступныя:

Рэпазіторый ВДУ

1) вызначэнне сутнасці паняццяў спецыяльнай лексікі і месца тэрміналогіі ў сістэме мовы;

2) аналіз ролі тэрміналогіі ў камунікатыўных працэсах;

3) даследаванне спецыфічных асаблівасцей тэрміна, асноўных праблем і тэндэнцый развіцця беларускай навуковай тэрміналогіі;

4) апісанне гістарычных вытокаў беларускай тэрміналогіі, асноўных сацыялінгвістычных фактараў яе развіцця на розных этапах фарміравання беларускай мовы;

5) вывучэнне сучаснай тэрміналогіі ў структурна-семантычным і словаўтваральным аспектах;

6) даследаванне праблем упарадкавання, нармалізацыі, інтэрнацыяналізацыі і уніфікацыі сучаснай беларускай тэрміналогіі;

7) аналіз тэрмінаграфічнай працы ў беларускім мовазнаўстве.

Дадзены курс дапаможа студэнтам асвоіць тэарэтычныя і практычныя пытанні тэрміназнаўства на сучасным этапе, набыць навыкі працы з тэрміналагічнымі слоўнікамі, з тэкстамі навуковага стылю, са спецыяльнай літаратурай, выконваць практычныя заданні для замацавання ведаў, пісаць даклады і рэфераты па найбольш важных праблемах навуковай тэрміналогіі, удзельнічаць у іх абмеркаванні, весці самастойны навуковы пошук праз напісанне курсавах і дыпломных прац па пытаннях курса. Набытыя ўменні і навыкі паспрыяюць эфектыўнай працы будучых спецыялістаў-філолагаў.

Курс “ Асновы тэрміназнаўства” разлічаны на 36 гадзін аўдыторных заняткаў ( лекцыйных – 20 гадзін, практычных – 16 гадзін).

**Прыкладны тэматычны план**

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | лекц. | практ. |
| 1. | Уводзіны. Прадмет і задачы тэрміназнаўства | 1 | 1 |
| 2. | Спецыфіка тэрмінаў. Семантычныя працэсы ў тэрміналогіі | 2 | 1 |
| 3. | Разрады спецыяльнай лексікі | 1 | 1 |
| 4. | Гісторыя станаўлення і развіцця беларускай і замежнай тэрміналогіі | 2 | 1 |
| 5. | Асаблівасці развіцця беларускай тэрміналогіі ў савецкі перыяд. Сучасны стан развіцця | 2 | 1 |
| 6. | Характарыстыка сучаснай беларускай тэрміналогіі паводле паходжання | 2 | 1 |
| 7. | Структурная і лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў | 2 | 2 |
| 8. | Асноўныя спосабы тэрмінаўтварэння | 2 | 2 |
| 9. | Упарадкаванне, інтэрнацыяналізацыя і міжнародная ўніфікацыя сучаснай тэрміналогіі | 2 | 2 |
| 10. | Беларуская тэрмінаграфія | 2 | 2 |
| 11. | Мова навукі і яе асаблівасці. Мовазнаўчая праблематыка ў сучаснай беларускай тэрміналогіі | 2 | 2 |

Репозиторий ВГУ

## Змест вучэбнага матэрыялу

**Тэма 1. Уводзіны. Прадмет і задачы тэрміназнаўства**

Лексіка агульнаўжывальная і абмежаванага выкарыстання. Спецыяльная лексіка ў складзе лексікі абмежаванага выкарыстання. Склад, аб’ём і межы спецыяльнай лексікі. Лінгвістычныя асаблівасці спецыяльнай лексікі. Падзел спецыяльнай лексікі на тэрміналогію, прафесіяналізмы і наменклатуру. Змест паняцця “тэрміналогія”. Праблемы размежавання тэрміналогіі як навукі і тэрміналогіі як сукупнасці тэрмінаў. Тэрміназнаўства як новая навуковая дысцыпліна, яе прадмет, асноўныя задачы, месца ў сістэме навук. Вызначэнне лінгвістычнага статусу як уласна тэрміна, так і тэрміналогіі ў цэлым. Актыўнае развіццё тэрміналогіі ў сучасную эпоху новых тэхналогій, інфармацыі, камп’ютарызацыі. Перспектыўнасць тэрміналогіі як аўтаномнага навуковага напрамку. Праблема класіфікацыі ў тэрміналогіі. Незавершанасць класіфікацыйнай работы ў працах даследчыкаў (В. Навіцкі, М. Юркоўскі, С. Груча, А.А. Рэфармацкі, В.П. Даніленка, П.Н. Дзянісаў, А.В. Суперанская). Розныя падыходы да класіфікацыі тэрмінаў: класіфікацыя тэрмінаў па галінах навук, па структуры тэрміна, паводле паходжання, паводле ўтварэння, паводле суадносін з лексемамі агульнага характару. Два напрамкі класіфікацыі ў тэрміналогіі: лінгвістычная класіфікацыя і тэрміналагічная класіфікацыя. Сувязь тэрміназнаўства з іншымі раздзеламі мовазнаўства і з нелінгвістычнымі навуковымі дысцыплінамі. Комплексны, міждысцыплінарны характар тэрміназнаўства. Роля і фунцыі тэрміналогіі ў камунікатыўных працэсах.

**Тэма 2. Спецыфіка тэрмінаў. Семантычныя працэсы ў тэрміналогіі**

Тэрмін як звычайная намінатыўная адзінка мовы з шэрагам лексіка-граматычных асаблівасцей. Вылучэнне тэрмінаў у самастойны клас слоў. Семіятычная прырода тэрміна і схільнасць да фармалізацыі. Камунікатыўна-намінатыўны характар тэрміна як спецыяльнай лексічнай адзінкі для спецыфічных камунікатыўных сітуацый. Спецыфічныя асаблівасці тэрмінаў: сістэмнасць, адназначнасць, неэкспрэсіўнасць, імкненне да адсутнасці сінаніміі, стылёвая нейтральнасць. Семантычныя працэсы ў тэрміналогіі: полісемія, аманімія, сінанімія, антанімія, гіпанімія.

**Тэма 3. Разрады спецыяльнай лексікі**

Тэрміны, наменклатурныя назвы, прафесіяналізмы як асноўныя разрады спецыяльнай лексікі. Характарыстыка дадзеных класаў слоў, іх прыметы, семантыка, асаблівасці функцыянавання, узаемадзеянне і адрозненні. Адносіны паміж тэрмінамі і агульнаўжывальнымі словамі, тэрмінамі і номенамі, тэрмінамі і прафесіяналізмамі. З’явы тэрміналагізацыі і дэтэрміналагізацыі ў тэрміналагічнай лексіцы. Размежаванне паняццяў тэрмін і номен у навуковых даследаваннях па тэрміналогіі (Г.О. Вінакур,

А.В.Суперанская, В.П. Даніленка, В.К. Шчэрбін). Адносіны паміж навуковай і народнай тэрміналагічнай лексікай.

**Тэма 4. Гісторыя станаўлення і развіцця беларускай і замежнай тэрміналогіі**

Асноўныя тэрміналагічныя школы і напрамкі іх працы: у Расіі (Д.С.Лотэ, А.А. Рэфармацкі) і ў Астрыі (Е. Вюстэр). Распрацоўка імі законаў тэрміназнаўства і правіл фарміравання канкрэтных тэрмінасістэм. Дзве тэндэнцыі развіцця тэрміналогіі: выкарыстанне ў ёй сродкаў намінацый агульнанароднай мовы і ўзрастанне аўтаноміі груп спецыяльнай лексікі. Стварэнне тэрмінаў на аснове канвенцыяльнасці.

Тэарэтычныя і практычныя пытанні стварэння навуковай і навукова-тэхнічнай тэрміналогіі на беларускай мове. Праблемы развіцця і функцыянавання сучаснай беларускай тэрміналогіі. Гістарычныя вытокі фарміравання беларускай тэрміналогіі. Асноўныя сацыялінгвістычныя фактары яе развіцця на розных этапах фарміравання беларускай мовы.

Утварэнне тэрмінасістэм розных галін ведаў (грамадска-палітычнай, юрыдычнай, гандлёвай, сельскагаспадарчай, прамысловай, ваеннай, мовазнаўчай і інш.). Даследаванне праблем тэрміналогіі ў беларускім мовазнаўстве (В.П. Красней, Л.А. Антанюк, Г А. Цыхун, Г.У. Арашонкава, А. І. Падлужны, А.М. Булыка, У.В. Люшцік, В.К. Шчэрбін, В.А. Ляшчынская і інш.).

**Тэма 5. Асаблівасці развіцця беларускай тэрміналогіі ў савецкі перыяд. Сучасны стан развіцця**

Пашырэнне сферы функцыянавання беларускай мовы ў 20-я гады XX ст. Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі. Стварэнне Навукова-тэрміналагічнай камісіі ( люты 1921 года). Асноўныя прынцыпы распрацоўкі беларускай нацыянальнай тэрміналогіі. Месца пурыстычнай тэндэнцыі ў дзейнасці Навукова-тэрміналагічнай камісіі. Выданні серыі “Беларуская навуковая тэрміналогія“ і іншыя тэрміналагічныя слоўнікі 20-х – пачатку 30-х гадоў. Моўная палітыка 30-х гадоў. Экстралінгвістычны аспект у развіцці беларускай тэрміналогіі. Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі ў 2-ой палове XX ст. Стварэнне ў 1979 г. Тэрміналагічнай камісіі пры АН БССР. Выданне “Беларускай Савецкай энцыклапеды“ ў 12-ці тамах, пяцітомнай “Энцыклапеды прыроды Беларусі” і “Энцыклапеды літаратуры і мастацтва”, спецыяльных тэрміналагічных слоўнікаў па розных галінах навукі. Вывучэнне асаблівасцей станаўлення і развіцця тэрміналагічных сродкаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў працах В.П. Краснея. Даследаванне беларускай тэрміналогіі і асобных тэрмінасістэм у працах Л. Антанюк, Г. Гваздовіч, І. Германовіча, М. Дабрыян і інш. Пашырэнне сферы функцыянавання беларускай мовы ў 1-ай палове 90-х гадоў XX ст. Распрацоўка энцыклапедычных і тэрміналагічных выданняў апошніх дзесяцігоддзяў як спосаб нармалізацыі беларускай навуковай тэрміналогіі. Даследаванне беларускай тэрміналогіі на сучасным этапе (В. К. Шчэрбін,

Репозиторий ВГУ

П. У. Сцяцко, У. В. Люшцік, Г. А. Цыхун, А. М. Лапкоўская, Т. В. Капейко, А. І. Калечыц, А. П. Занкавіч і інш.)

Аналіз сацыялінгвістычных фактараў выкарыстання беларускай навукова-тэхнічнай тэрміналогіі на сучасным этапе. Ужыванне ў навукова-тэхнічнай сферы рускай тэрміналогіі. Асаблівасці функцыянавання беларускай тэрміналогіі на сучасным этапе.

**Тэма 6. Характарыстыка сучаснай беларускай тэрміналогіі паводле паходжання**

Спрадвечна беларуская і запазычаная лексіка ў складзе тэрмінасістэм. Агульналітаратурныя словы як крыніца стварэння новых тэрмінаў і папаўнення канкрэтных галіновых тэрміналагічных сістэм. Утварэнне простых (аднаслоўных) тэрмінаў шляхам тэрміналагізацыі агульналітаратурных слоў. Тэрміналагічнае значэнне агульнаўжывальных лексем у складзе састаўных тэрмінаў. Пераноснае ўжыванне агульналітаратурных слоў як спосаб выкарыстання лексікі агульналітаратурнай мовы ў стварэнні навуковых тэрмінаў. Утварэнне беларускіх тэрмінаў шляхам сэнсавага перакладу і калькавання рускіх тэрмінаў. Запазычванне іншамоўных тэрмінаў. Выкарыстанне інтэрнацыянальных элементаў у тэрміналогіі. Тэрміны са звязанымі кампанентамі грэчаскага паходжання. Тэрміны са звязанымі кампанентамі лацінскага і раманскага паходжання. Тэрміны з інтэрнацыянальнымі прэфіксальнымі элементамі. Тэрміны, утвораныя спосабам словаскладання на базе запазычанай лексікі.

**Тэма 7. Структурная і лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў**

Структурныя тыпы тэрмінаў: тэрміны-словы (невытворныя, вытворныя, складаныя, абрэвіятуры), тэрміны-словазлучэнні (свабодныя і несвабодныя), сімвалы-словы (камбінаваны структурны тып у матэматычнай, фізічнай, хімічнай тэрміналогіі). Структурныя асаблівасці тэрмінаў розных галін ведаў. Суадносіны тэрмінаў і часцін мовы. Назоўнік як асноўны лексіка-граматычны сродак тэрміналогіі. Уключэнне у склад тэрміналогіі іншых часцін мовы: прыметнікаў, дзеясловаў, прыслоўяў, лічэбнікаў. Дзеепрыметнік у беларускай тэрміналогіі. Асаблівасці функцыянавання розных часцін ў тэрміналогіі.

**Тэма 8. Асноўныя спосабы тэрмінаўтварэння**

Выкарыстанне ў тэрміналагічным словаўтварэнні ўсіх спосабаў словаўтваральнай сістэмы беларускай мовы: семантычнага, сінтаксічнага, марфалагічнага. Марфалагічны спосаб як асноўны ў тэрмінатворчасці, яго адметныя рысы. Афіксальныя словаўтваральныя мадэлі, іх прадуктыўнасць. Дэрывацыйныя структуры ў тэрміналагічных слоўніках 90-х гадоў XX ст. Праблемы словаўтварэння ў сучаснай беларускай тэрміналогіі.

Прадуктыўнасць сінтаксічнага спосабу тэрмінаўтварэння, яго асаблівасці. Спосабы ўтварэння канкрэтных груп тэрмінаў. Даследаванні

Репозиторий ВГУ

Л.А.Антанюк і В.П.Даніленка па дадзеных праблемах. Утварэнне тэрмінаў катэгорыі прадметаў і з'яў. Утварэнне тэрмінаў катэгорыі працэсаў і дзеянняў. Утварэнне тэрмінаў катэгорыі прафесій і сфер дзейнасці. Утварэнне тэрмінаў катэгорыі якасцей і ўласцівасцей. Марфемная структура тэрмінаў. Марфалагічныя сродкі ўтварэння тэрмінаў. Паняцце пра тэрмінаэлемент.

Тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя розных часцін мовы.

**Тэма 9. Упарадкаванне, інтэрнацыяналізацыя і міжнародная ўніфікацыя сучаснай тэрміналогіі**

Задачы ўпрадкавання сучаснай беларускай тэрміналогіі розных галін ведаў. Асноўныя аспекты ўпарадкавання навуковай тэрміналогіі: спецыяльна-навуковае (змястоўнае) і лінгвістычнае. Сістэматызацыя і ўдакладненне навуковых паняццяў і адпаведных тэрмінаў канкрэтных галін навукі. Сістэматызацыя моўнага афармлення навуковых тэрмінаў. Распрацоўка прынцыпаў пабудовы ўпарадкаваных тэрмінасістэм. Праблема канструявання навуковай тэрміналогіі. Стандартызацыя тэрміналогіі. Праца спецыяльных тэрміналагічных камісій, аб'яднаных у міжнародныя арганізацыі (JSO ў Жэневе, JNEOTERM у Вене). Адпаведнасць тэрміна моўным нормам. Крытэрыі, якія вызначаюць тэрміналагічную норму: адпаведнасць мадэляў утварэння мадэлям роднай мовы; магчымасць інтэрнацыяналізацыі. Інтэрнацыяналізацыя і міжнародная уніфікацыя сучаснай тэрміналогіі. Тэарэтычныя і практычныя пытанні ўпарадкавання навуковай і навукова-тэхнічнай тэрміналогіі на беларускай мове. Вырашэнне праблем унармавання беларускай тэрміналогіі ў сферы фіксацыі і функцыянавання ў працах апошніх дзесяцігоддзяў.

**Тэма 10. Беларуская тэрмінаграфія**

Задачы і метадалогія беларускай тэрмінаграфіі. Сістэмнае апісанне спецыяльнай лексікі, якая выкарыстоўваецца ў навукова-тэхнічных тэкстах. Асаблівасці пабудовы слоўнікавага артыкула ў тэрміналагічным слоўніку.

Асаблівасці тэрмінаграфічнай працы ў Беларусі на розных этапах развіцця беларускай мовы, пачынаючы з 20-х гадоў XX ст. і заканчваючы апошнімі дзесяцігоддзямі. Распрацоўка спецыяльных слоўнікаў у 80-90-я гады, іх характарыстыка. Асноўныя напрамкі сучаснай беларускай тэрмінаграфіі (праектыўная, нарматыўная і апісальная тэрмінаграфія).

Навейшыя энцыклапедычныя і галіновыя слоўнікі, іх месца ў лексікаграфічнай практыцы апошніх гадоў. Першы выпуск бібліяграфіі беларускай тэрміналогіі "Тэрміналагічныя слоўнікі (асобныя выданні) 1918-1998 гг." (Мн., 2000).

Метадалагічныя, сацыялінгвістычныя і камп'ютарныя праблемы сучаснай беларускай тэрмінаграфіі. Ідэя стварэння навукова-даследчага праекта "Машынны фонд беларускай мовы". Праблема фарміравання тэрміналагічных банкаў даных па розных галінах ведаў. Праблема стварэння Нацыянальнай службы слова.

Репозиторий ВГУ

**Тэма 11. Мова навукі і яе асаблівасці. Мовазнаўчая праблематыка ў сучаснай беларускай тэрміналогіі**

Стылі мовы. Навуковы стыль, яго асаблівасці. Лексічныя і фразеалагічныя асаблівасці навуковых тэкстаў. Тэрміналогія ў навуковым стылі. Марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў. Праблемы правапісу ў беларускай тэрміналогіі. Праблемы формазмянення ў сучаснай тэрміналогіі. Уласныя імёны ў тэрміналагічных слоўніках апошніх дзесяцігоддзяў.

## ЛІТАРАТУРА

### *Асноўная*

1. Акуленко В.В. Научно-техническая революция и проблема интернациональной терминологии // Научно-техническая революция и функционирование языков мира. М., 1977.
2. Акуленко В.В. Лексические интернационализмы: Итоги, перспективы, методы исследования // Интернациональные элементы в лексике и терминологии. Харьков, 1980.
3. Антанюк Л.А., Бірыла М.В. Развіццё беларускай лінгвістычнай тэрміналогіі і праблемы яе ўпарадкавання // Славянская лингвистическая терминология. Киев, 1984.С. 5 – 15.
4. Антанюк Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне. Мн., 1987.
5. Антанюк Л.А. Сучасная беларуская тэрміналогія. Мн., 1995.
6. Антанюк Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія. Мн., 2002.
7. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: Вуч.-метад. дапам. / В.У.Азарка, А.С.Васілеўская, М.М.Круталевіч. 2-е выд. Мн., 2005.
8. Белорусский язык. Профессиональная лексика: Учеб. пособие/ Е.Н.Руденко, А.А.Кожинова, Е.Г.Задворная. Мн., 2005.
9. Головин Б.Н., Кобрин Р.Ю. Лингвистические основы учения о терминах. М., 1987.
10. Даниленко В.П. Русская терминология: Опыт лингвистического описания. М., 1977.
11. Канделаки Т.Л. Семантика и мотивированность терминов. М., 1977.
12. Красней В.П. Генетычная характырыстыка беларускай тэрміналагічнай лексікі пачатку XX ст. // Веснік БДУ імя У.І. Леніна. Сер. IV. 1980. №3. С. 21 – 22.
13. Лингвистические проблемы научно – технической терминологии. М., 1970.
14. Ляшчынская В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка. Мн., 2001.

Репозиторий ВГУ

15. Ляшчынская В.А. Студэнту аб мове: прафесійная лексіка: Вучэб.дапам. Мн., 2003.
16. Плотнікаў Б.А., Антанюк Л.А., Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мн., 2003.
17. Практыкум па беларускай мове / Пад рэд. Г.М. Малажай., 1993.
18. Реформатский А.А. Что такое термин и терминология? // Вопросы терминологии. М., 1961.
19. Смольская Т.М. Беларуская мова. Юрыдычная лексіка. Вучэб.дапам. Мн., 2006.
20. Сямешка Л.І., Шкраба І.Р., Бадзевіч З.І. Курс беларускай мовы., Мн., 1996.
21. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі. Мн., 1999.

### *Дадатковая*

1. Антанюк Л.А. Развіццё і задачы ўпарадкавання беларускай навуковай тэрміналогіі //Тэрмінал. зборнік "83". Мн., 1985. С. 5-17.
2. Антонюк Л.А.О терминологическом словосочетании как номинативной единице // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках: Тезисы докл. республ. конференции. Гродно, 1982. Ч.2 С.8-10.
3. Бородич М.А., Гируцкий А.А., Чернышова Л.В. Сопоставительный курс русского и белорусского языков. Мн. 1999.
4. Булыка А.М. Выкарыстанне інтэрнацыянальных прэфіксальных сродкаў у беларускай тэрміналогіі // Беларуская мова ў другой палове XX ст.: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 22-24 кастрычніка 1997г.) Мн. 1998.С.96-99.
5. Вардамацкі Л.М. Праблемы тэрміналогіі ў сучасным сусветным і польскім мовазнаўстве //Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства. Віцебск, 1994.
6. Вардамацкі Л.М. Тэрміны і номены як спецыфічныя класы намінатыўнай лексікі // Веснік ВДУ. 1996. № 1. С. 62-66.
7. Вардомацкий Л.М. Традиции и новаторство в белорусской и русской биологической терминологии //Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства. Віцебск, 1993.
8. Грачыха Т.А. Да праблемы варыянтнасці ў беларускай фауністычнай тэрміналогіі // Пытанні нармалізацыі беларускай навуковай тэрміналогіі. Матэрыялы Рэспубл. навук. канф. Гомель, 1994.
9. Грачыха Т.А. Фарміраванне беларускай фауністычнай наменклатуры //Роднае слова. 1998. № 2.
10. Даниленко В.П. О терминологическом словообразовании // Вопросы языкознания. М., 1973. №4. С. 76-83.
11. Даниленко В.П. Русская терминология. Опыт лингвистического описания. М., 1997.

Репозиторий ВГУ

12. Красней В.П. Аб сінонімах, дублетах і варыянтах у тэрміналогіі // Веснік БДУ. Серыя 4. 1995. № 1.
13. Красней В.П. Да пытання аб вывучэнні беларускай тэрміналагічнай лексікі 20-х гадоў// Весн. БДУ. Сер.4. 1984. №3.С. 13-17.
14. Красней В.П. Навуковы стыль сучаснай беларускай літаратурнай мовы // Беларуская мова ў другой палове XX ст.: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі ( Мінск, 22-24 кастрычніка 1997 г.). Мн., 1998. С. 16 – 19.
15. Красней В.П. Некаторыя асаблівасці выпрацоўкі і ўдасканалення беларускай тэрміналогіі ў савецкі час //Весці БДУ. Сер.4. 1997. № 2. С. 28-32.
16. Красней В.П. Роля жывой народнай мовы ў фарміраванні і развіцці беларускай тэрміналагічнай лексікі //Рэгіянальныя традыцыі ва ўсходнеславянскіх мовах, літаратурах і фальклоры: Тэз. дакл. 2 рэсп. навук.канф. Гомель, 1980. С. 64-65.
17. Лапкоўская А.М. Некаторыя пытанні развіцця і станаўлення беларускай батанічнай тэрміналогіі //Беларуская мова ў другой палове XX ст.: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 22-24 кастрычніка 1997 г.). Мн., 1998. С. 124-127.
18. Лотте Д.С. Вопросы заимствования и упорядочения иноязычных терминов и терминоэлементов. М., 1982.
19. Лотте Д.С. Основы построения научно-технической терминологии. Вопросы теории и методики. М., 1961.
20. Михайлишин Б.П. Природа, функции и стилевые характеристики терминов-аббревиатур //Беларуская мова ў другой палове XX ст.: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 22-24 кастрычніка 1997 г.). Мн., 1998. С. 130-138.
21. Общая терминология: Вопросы теории / Отв. ред. Т.Л.Канделаки. Изд. 2-е. М., 2003.
22. Праблемы беларускай навуковай тэрміналогіі //Матэр. 1-ай нац. канф. Мн., 1995.
23. Пытанні нармалізацыі беларускай навуковай тэрміналогіі //Матэр. рэспубл. навук. канф. Гомель, 1994.
24. Станкевіч А.А. Дэтэрміналагізацыя тэрмінаў іншамоўнага паходжання ў сучаснай беларускай мове //Беларуская мова. 1997. Вып. 5 С. 27-34.
25. Сцяцко П.У. Дзеепрыметнікавая тэрміналагічная лексіка рускай мовы і яе адпаведнікі ў беларускай //Навуково-технічный прогрес і проблема термінології: Тез. докл. респ. конф. Київ, 1980. С. 162-163.
26. Сцяцко П.У. Мовазнаўчы досвед (выбраныя творы):У 2 ч. Гродна, 2005. Ч. 2. Культура мовы. Тэрміналогія.
27. Тэрміналагічныя слоўнікі (асобныя выданні) 1918 – 1998 гг.: (Бібліягр. давед.) Рэд. Г.Цыхун. Мн., 2000.
28. Шчэрбін В.К. Асноўныя напрамкі сучаснай беларускай тэрмінаграфіі // Веснік БДУ. Сер.4. 1995. № 2.
Репозиторий ВГУ

29. Шчэрбін В.К. Асноўныя этапы тэрмінатворчай дзейнасці //Тэрмінал. зборнік “89/90”. Мн., 1992. С. 4-8.
30. Шчэрбін В.К. Тэарэтычныя праблемы беларускай лексікаграфіі. Мн., 1996.

## *Слоўнікі*

1. Анатомія і марфалогія бесхрыбетных жывёл: Руска-беларускі слоўнік / Беларус. дзярж. пед. ун-т; Скл. А.Р.Александровіч, У.С. Бірг. Мн., 1997.
2. Анаціраваны спіс хрыбетных жывёл Беларусі: Метадычныя рэкамендацыі/ Мін. дзярж. пед. ін-т; Укл. А.Р.Александровіч, У.М.Дучыц, Т.М.Курскова, Н.П.Лобань, А.У.Хандогі. Мн., 1993.
3. Андрыеўская З., Галай І. Руска-беларускі фізіка-геаграфічны слоўнік. Мн., 1993.
4. Аранская В., Слабін У. Руска-беларускі тлумачальны слоўнік вытворча-значных тэрмінаў і паняццяў па хіміі /Віцеб. дзярж. пед. ін-т. Віцебск, 1993.
5. Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Кароткі слоўнік беларускай мовы: Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне. Мн., 1994.
6. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік. Мн., 2004.
7. Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн., 1994.
8. Беларуская савецкая энцыклапедыя: У 12 т. Мн., 1970 – 1975.
9. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Мн., 1996 – 2004.
10. Беларуска-рускі слоўнік: У 2 т. /АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа. Мн., 1989.
11. Беларуска-рускі тэрміналагічны тлумачальны слоўнік па батаніцы і кветкаводстве / Беларус. дзярж. тэхнал. ун-т; Скл. Т.М.Бурганская, Л.С.Пашкевіч, А.І.Скорабагатая; Нав. рэд. В.Р. Анціпаў. Мн., 1996.
12. Болсун А.І., Рапановіч Я.Н. Слоўнік фізічных і астранамічных тэрмінаў. Мн., 1979.
13. Булыка А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: У 2 т. Мн., 1999.
14. Воднеў У.Т., Навумовіч А.Ф., Навумовіч Н.Ф. Малы матэматычны слоўнік. Мн., 1994.
15. Галай І.П., Сідор С.І. Геаграфічны слоўнік школьніка /Пад рэд. В.А. Жучкевіча. Мн., 1986.
16. Геаграфічныя паняцці і тэрміны: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993.
17. Грабчыкаў С.М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы. Мн., 1994.
18. Грачыха Т.А. Дыялектны тэматычны слоўнік найменняў іхтыя- і герпетафауны Беларускага Паазер’я. Віцебск, 2006.
19. Інфарматыка: Беларуска-рускі тэрміналагічны слоўнік/ Пад агульнай рэд. А.І. Паўлоўскага. Мн., 1996.

Репозиторий ВГУ

20. Калугін А.С. Тэрміналагічны беларуска-рускі слоўнік па анатоміі і фізіялогіі чалавека і жывёл для студэнтаў біялагічнага і фізкультурнага факультэтаў /Гомел. дзярж. ун-т. Гомель, 1994.
21. Кароткі руска-беларускі слоўнік біялагічнай тэрміналогіі /Віцеб. дзярж. пед. ін-т; Скл. Т.М.Царэнка. Віцебск, 1994.
22. Кароткі руска-беларускі слоўнік музычных тэрмінаў /Скл. А.І.Смагін, Н.В. Шутовіч. Мн., 1992.
23. Кароткі руска-беларускі слоўнік прыродазнаўчай тэрміналогіі для пачатковых класаў /Магіл. дзярж. пед. ін-т; Укл. М.П.Бузук, А.Л.Курдзюкоў; Рэд. А.С.Лаўшук. Магілёў, 1991.
24. Кароткі руска-беларускі тлумачальны слоўнік па агульнай біялогіі /Беларус. дзярж. пед. ун-т; Укл. М.Д.Лісаў, П.А.Міхайлаў, Э.А.Камінская, Г.А.Пісарчык. Мн., 1994.
25. Кароткі тлумачальны слоўнік педагагічных тэрмінаў / Укл. А.І.Андарала, Г.Ф.Андарала. Мн., 1995.
26. Кароткі тлумачальны слоўнік тэрмінаў па мікрабіялогіі /Мін. дзярж. пед. ін-т; Скл. Р.У.Тузава, К.М.Панюціч. Мн.,1991.
27. Клышка М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. Мн., 1994.
28. Краткий русско-белорусский словарь терминов по спортивным играм. Гродно, 1996.
29. Лазоўскі У.М. Слоўнік антонімаў беларускай мовы. Мн., 1994.
30. Лазука Б.А. Слоўнік тэрмінаў: Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Мн., 2001.
31. Лобан М.П., Суднік М.Р. Арфаграфічны слоўнік. Мн., 1990.
32. Люшцік У.В. Руска-беларускі слоўнік тэрмінаў нафта- і газаздабычы. Мн., 1997.
33. Народная культура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / Пад рэд. В.С.Цітова. Мн., 2002.
34. Павловец Д.Д., Старченко В.Н. Русско-белорусский словарь спортивных терминов. Мн, 1995.
35. Падручны руска-беларускі слоўнік біялагічных тэрмінаў /Беларус. дзярж. ун-т; Аўт.-скл. І.Л.Бурак, Т.П.Піліповіч. Мн., 1992.
36. Прыгодзіч М.Р. Асобна, разам, праз дэфіс: Слоўнік-даведнік. Мн., 1994.
37. Радкевич В.А., Вардомацкий Л.М., Лешко А.А. Биологическая терминология и номенклатура: Словарь русско-белорусско-латинский, белорусско-русский. Мн., 1993.
38. Руска-беларускі слоўнік: У 3 т. Мн., 1995.
39. Руска-беларускі слоўнік па псіхалогіі /Скл. Т.У.Васілец, Я.Л.Каламінскі, Р.А. Макарэвіч. Мн., 1991.
40. Руска-беларускі слоўнік хімічных тэрмінаў /Беларус. дзярж. пед. ун-т; Укл. І.А.Семяновіч, А.С.Ціханаў, В.В.Канаш. Мн., 1995.
41. Руска-беларускі, беларуска-рускі слоўнік па выяўленчым мастацтве і архітэктуры / Мін.дзярж. пед. ін-т; Склад. І.Р.Чыкалава. Мн., 1992.

Репозиторий ВГУ

42. Руска-беларускі музычна-педагагічны слоўнік /МДПІ імя М.Горкага; Навук. рэд А.У.Рагуля. Мн., 1991.
43. Руска-беларускі слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі. Мн., 1994.
44. Русско-белорусский математический словарь / Под ред. Я.В. Радыно. Мн., 1993.
45. Русско-белорусский словарь лингвистических терминов. Мн., 1988.
46. Русско-белорусский словарь по морфологии и анатомии растений /Белорус. гос. пед. ун-т; Сост. Л.М.Ерей, С.Т. Кухарева, Т.Н. Никитина. Мн., 1993.
47. Руско-белорусский словарь по физиологии растений / Мин.гос. пед. ин-т; Сост. Л.Б.Утыро. Мн., 1992.
48. Русско-белорусский терминологический словарь по физической географии /Сост. Б.Н. Гурский, А.М. Баско. Мн., 1990.
49. Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне /Пад рэд. М.В.Бірылы. Мн., 1987.
50. Сухая Т., Еўдакіменка Р., Траццякевіч В., Гудзень Н. Тэрміналагічны слоўнік па вышэйшай матэматыцы для ВНУ /Навук. рэд. П. Міхайлаў. Мн., 1993.
51. Сцяцко П.У., Гуліцкі М.Ф., Антанюк Л.А. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў. Мн., 1990.
52. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т. Мн., 1977–1984.
53. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1999.
54. Экалагічны слоўнік. – Экологический словарь: Кн. для вучняў /Пад рэд. Кручковай. Мн,, 1993.
55. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мн.,1984 – 1987.
56. Энцыклапедыя прыроды Беларусі: У 5 т. Мн., 1983 – 1986.
57. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989.
58. Юрэвіч А.Л. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў. Мн., 1962.
59. Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік. Мн., 1992.

Репозиторий ВГУ

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ

Тэма 1. **Уводзіны. Мова навукі і яе асаблівасці**

Пытанні:

1. Склад, аб'ём і межы спецыяльнай лексікі. Змест паняцця "тэрміналогія".
2. Тэрміназнаўства як новая навуковая дысцыпліна, яе прадмет, асноўныя задачы, месца ў сістэме навук.
3. Лінгвістычная і тэрміналагічная класіфікацыя ў тэрміналогіі.
4. Асноўныя этапы развіцця развіцця тэрміназнаўства. Асноўныя тэрміналагічныя школы і напрамкі іх працы.
5. Стылі. Навуковы стыль, яго асаблівасці. Тэрміналогія ў навуковым стылі.
6. Лексічныя і фразеалагічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
7. Марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
8. Праблемы правапісу, формазмянення і словаўтварэння ў тэрміналогіі.

Выкананне заданняў:

Практыкаванні: 2(с.116), 5 (с.141), 7(с.141) (гл. літаратуру №3).

Пераклад тэрмінаў розных тэрмінасістэм з рускай мовы на беларускую.

Абмеркаванне рэфератаў на тэму: "Моўныя асаблівасці навуковых тэкстаў", "Праблемы словаўтварэння ў тэрміналогіі".

Літаратура:

1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003. – С.343-441.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшчік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія: вучэб. дапам. / Антанюк Л.А. –Мінск, 2002.

Тэма 2. **Агульналінгвістычная характарыстыка тэрміна**

Пытанні:

1. Спецыфічныя асаблівасці тэрмінаў: сістэмнасць, адназначнасць, неэкспрэсіўнасць, стылёвая нейтральнасць, імкненне да адсутнасці сінаніміі.
2. Семантычныя працэсы ў тэрміналогіі: полісемія, аманімія, сінанімія, антанімія, гіпанімія.
3. З'явы тэрміналагізацыі і дэтэрміналагізацыі ў тэрміналагічнай лексіцы.
4. Адносіны паміж тэрмінамі і агульнаўжывальнымі словамі.
5. Адносіны паміж тэрмінамі і наменклатурай, размежаванне паняццяў тэрмін і номен у навуковых даследаваннях.
6. Адносіны паміж тэрмінамі і прафесіяналізмамі.

Репозиторий ВГУ

Выкананне заданняў:

Практыкаванні: 4(с.140), 6(с.141), 9(с.143), 10(с.144) (гл. літаратуру №3); 13(с.69) (гл. літ. №6).

Пераклад тэкстаў навуковага стылю розных галін ведаў з рускай мовы на беларускую.

Абмеркаванне рэфератаў на тэму: “Сінонімы, дублеты і варыянты ў тэрміналогіі”; “Структурна-семантычная характарыстыка тэрмінасістэм”.

Літаратура:


1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003. – С.343-441.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.


Тэма 3. **Фарміраванне і развіццё беларускай тэрміналогіі ў розныя перыяды. Сучасны стан развіцця**

Пытанні:

1. Гістарычныя вытокі фарміравання беларускай тэрміналогіі. Асноўныя сацыялінгвістычныя фактары яе развіцця на розных этапах фарміравання беларускай мовы.
2. Утварэнне тэрмінасістэм розных галін ведаў: грамадска-палітычная, юрыдычная, гандлёвая, сельскагаспадарчая, промыславая, ваенная, мовазнаўчая.
3. Распрацоўка беларускай тэрміналогіі ў 20-30-я гады XX ст.
4. Распрацоўка беларускай тэрміналогіі ў 2-ой палове XX ст.
5. Асаблівасці развіцця беларускай тэрміналогіі ў 80-90-я гады XX ст. Сучасны стан яе развіцця.
6. Энцыклапедычныя і тэрміналагічныя выданні. Працы беларускіх мовазнаўцаў па тэрміналогіі.

Выкананне заданняў:

Практыкаванні: 13, 18, 25, 26 (с.69-78) (гл. літаратуру №6); 3(с.183), 7(с.187) (гл. літ. №3).

Пераклад тэрмінаў розных тэрмінасістэм з рускай мовы на беларускую.

Репозиторий ВГУ

Абмеркаванне рэфератаў на тэму: “Генетычная характарыстыка беларускай тэрміналогіі пачатку XX стагоддзя”; “Распрацоўка і ўдасканаленне беларускай тэрміналогіі ў савецкі час”.

Літаратура:


1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003. – С.343-441.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Кругалевіч. – Мінск, 2005.


Тэма 4**. Характарыстыка беларускай тэрміналогіі паводле паходжання**

Пытанні:

1. Спрадвечна беларуская і запазычаная лексіка ў складзе тэрмінасістэм.
2. Агульнаўжывальныя словы як крыніца развіцця тэрміналагічных сістэм Утварэнне тэрмінаў шляхам тэрміналагізацыі агульналітаратурных слоў.

3. З’ява метафарызацыі ў стварэнні навуковых тэрмінаў.

4. Сэнсавы пераклад і калькаванне рускіх тэрмінаў.

5. Запазычванне іншамоўных тэрмінаў.

6. Інтэрнацыянальныя элементы ў тэрміналогіі.

Выкананне заданняў:

Практыкаванні: 2,3, 5, 6, 8, 9, 10,12 (с.219-226) (гл. літаратуру №3).

Праца з этымалагічным, тлумачальным, гістарычным слоўнікам беларускай мовы, “Слоўнікам іншамоўных слоў” А.М. Булыкі.

Абмеркаванне рэфератаў на тэму: “Тэрміны з інтэрнацыянальнымі элементамі грэчаскага і лацінскага паходжання”.

Літаратура:


1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003. – С.343-441.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.


Репозиторий ВГУ

6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.
7. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапам. / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.

Тэма 5. **Структурная і лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў**

Пытанні:

1. Структурныя тыпы тэрмінаў: тэрміны-словы, тэрміны-словазлучэнні, тэрміны-сімвалы.
2. Структурныя асаблівасці тэрмінаў розных галін ведаў.
3. Суадносіны тэрмінаў і часцін мовы. Лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў.
4. Асаблівасці функцыянавання розных часцін мовы ў тэрміналогіі: назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, дзеепрыметнік, прыслоўе. Спрэчнасць поглядаў на лексіка-граматычную характарыстыку тэрмінаў.

Выкананне заданняў:

Практыкаванні: 1, 4, 5, 7, 8, 9 (с.202-205) (гл. літаратуру №3).

Пераклад дзеепрыметнікаў у тэкстах навуковага стылю з рускай мовы на беларускую.

Абмеркаванне рэферата на тэму:” Дзеепрыметнік у беларускай тэрміналогіі”.

Літаратура:

1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003. – С.343-441.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшчік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.
7. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапам. / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.
8. Семянькова, Г.К. Беларуская мова (спецыяльная лексіка): вучэб.-метад. комплекс / Г.К. Семянькова. – Віцебск, 2004.

Тэма 6. **Асноўныя спосабы тэрмінаўтварэння**

Пытанні:

1. Асноўныя спосабы ў тэрміналагічным словаўтварэнні: марфалагічны, сінтаксічны, семантычны.
2. Марфалагічны спосаб як асноўны ў тэрмінатворчасці, яго адметныя рысы, словаўтваральныя мадэлі.

Репозиторий ВГУ

3. Праблемы словаўтварэння ў сучаснай беларускай тэрміналогіі.
4. Прадуктыўнасць сінтаксічнага спосабу тэрмінаўтварэння, яго асаблівасці.
5. Семантычны спосаб утварэння тэрмінаў. Тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя розных часцін мовы.
6. Спосабы ўтварэння канкрэтных груп тэрмінаў.
7. Адрозненні тэрмінаўтварэння ў параўнанні з агульналітаратурным словаўтварэннем.

Выкананне заданняў:

Практыкаванні: 4, 6, 8, 11 (с.241-248) (гл. літаратуру №3).

Праца з тэрміналагічнымі слоўнікамі па вызначэнні спосабаў утварэння тэрмінаў.

Абмеркаванне навуковых прац па фарміраванні, станаўленні і развіцці некаторых тэрмінасістэм у беларускай мове.

Літаратура:


1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.
7. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапам. / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.
8. Семянькова, Г.К. Беларуская мова (спецыяльная лексіка): вучэб.-метад. комплекс / Г.К. Семянькова. – Віцебск, 2004.


Тэма7. **Праблемы ўпарадкавання і нармалізацыі навуковай тэрміналогіі**

Пытанні:

1. Адпаведнасць тэрміна моўным нормам. Крытэрыі, якія вызначаюць тэрміналагічную норму: адпаведнасць мадэляў утварэння мадэлям роднай мовы, магчымасць інтэрнацыяналізацыі.
2. Стандартызацыя тэрміналогіі.
3. Задачы ўпарадкавання сучаснай беларускай тэрміналогіі.
4. Асноўныя этапы тэрмінатворчай дзейнасці.
5. Асноўныя аспекты ўпарадкавання тэрміналогіі.
6. Інтэрнацыяналізацыя і міжнародная ўніфікацыя сучаснай беларускай тэрміналогіі.

Выкананне заданняў:

Репозиторий ВГУ

Практыкаванні: 7, 10 (с.244-246), 9, 12 (с.224-227) (гл. літаратуру №3).

Праца з тэрміналагічнымі слоўнікамі па вызначэнні праблем упарадкавання беларускай тэрміналогіі..

Абмеркаванне навуковых прац па фарміраванні, станаўленні, развіцці і ўпарадкаванні некаторых тэрмінасістэм у беларускай мове.

Літаратура:


1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшчік У.В., Падлужны А.I.; навук. рэд. А.I. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.
7. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапам. / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.
8. Семянькова, Г.К. Беларуская мова (спецыяльная лексіка): вучэб.-метад. комплекс / Г.К. Семянькова. – Віцебск, 2004.
9. Грачыха, Т.А. Дыялектны тэматычны слоўнік найменняў іхтыя-і герпетафаўны Беларускага Паазер'я / Т.А. Грачыха. – Віцебск, 2006.


Тэма 8. **Станаўленне і развіццё беларускай тэрмінаграфіі**

Пытанні:

1. Задачы і метадалогія беларускай тэрмінаграфіі.
2. Асаблівасці пабудовы слоўнікавага артыкула ў тэрміналагічным слоўніку.
3. Асаблівасці тэрмінаграфічнай працы ў Беларусі на розных этапах развіцця беларускай мовы (з 20-х гадоў XX ст. па наш час)
4. Характарыстыка сучасных галіновых слоўнікаў, мовазнаўчая праблематыка ў іх.
5. Асноўныя напрамкі сучаснай беларускай тэрмінаграфіі.
6. Метадалагічныя, сацыялінгвістычныя, камп'ютарныя праблемы сучаснай беларускай тэрмінаграфіі.

Выкананне заданняў:

Выкананне тэставых заданняў.

Праца з тэрміналагічнымі слоўнікамі па вызначэнні праблем упарадкавання беларускай тэрміналогіі.

Абмеркаванне навуковых прац па фарміраванні, станаўленні, развіцці і ўпарадкаванні некаторых тэрмінасістэм у беларускай мове.

Літаратура:

Репозиторий ВГУ

1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшчік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.
7. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапам. / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.
8. Семянькова, Г.К. Беларуская мова (спецыяльная лексіка): вучэб.-метад. комплекс / Г.К. Семянькова. – Віцебск, 2004.
9. Грачыха, Т.А. Дыялектны тэматычны слоўнік найменняў іхтыя-і герпетафаўны Беларускага Паазер’я / Т.А. Грачыха. – Віцебск, 2006.

Репозиторий ВГУ

**Пытанні**
**па дысцыпліне “Асновы тэрміназнаўства”**

1. Навуковы стыль, яго характарыстыка. Лексічныя і фразеалагічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
2. Марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
3. Паняцце аб спецыяльнай лексіцы і тэрміналогіі. Тэрміназнаўства як новая навуковая дысцыпліна, яе прадмет, задачы, месца ў сістэме навук, праблемы і перспектывы.
4. Тэрмін і яго характэрныя прыкметы. Спецыфічныя асаблівасці тэрмінаў.
5.Семантычныя працэсы ў тэрміналогіі: полісемія, сінанімія, антанімія, гіпанімія.
6. Разрады спецыяльнай лексікі: тэрміны, наменклатурныя назвы, прафесіяналізмы. Узаемаадносіны паміж імі і размежаванне дадзеных паняццяў.
7. Фарміраванне і развіццё беларускай тэрміналогіі розных галін ведаў (грамадска-палітычная, юрыдычная, гандлёвая, сельскагаспадарчая, промыславая, ваенная тэрміналогія).
8. Фарміраванне і развіццё беларускай мовазнаўчай тэрміналогіі.
9. Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі ў 20-30-я гады XX ст.
10. Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі ў 2-ой палове XX ст.
11. Асаблівасці развіцця і функцыянавання беларускай тэрміналогіі на сучасным этапе.
12. Спрадвечна беларуская лексіка ў складзе тэрмінасістэм. Агульнаўжывальныя словы як крыніца развіцця тэрміналагічных сістэм.
13. Калькаванне рускіх тэрмінаў і запазычванне іншамоўных тэрмінаў у беларускай тэрміналогіі. Выкарыстанне інтэрнацыянальных элементаў.
14. Структурныя тыпы тэрмінаў: тэрміны-словы, тэрміны-словазлучэнні, сімвалы-словы. Структурныя асаблівасці тэрмінаў розных галін ведаў.
15. Лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў. Асаблівасці функцыянавання розных часцін мовы ў тэрміналогіі.
16. Дзеепрыметнік у беларускай тэрміналогіі, асаблівасці яго функцыянавання.
17. Асноўныя спосабы тэрмінаўтварэння: марфалагічны, сінтаксічны, семантычны. Сінтаксічны спосаб утварэння тэрмінаў, яго характарыстыка.
18. Марфалагічны спосаб утварэння тэрмінаў (прэфіксальны, суфіксальны, прэфіксальна-суфіксальны, аснова- і словаскладанне, складана-суфіксальны, бяссуфіксны, абрэвіятурны).
19. Праблемы словаўтварэння ў сучаснай беларускай тэрміналогіі. Дэрывацыйныя структуры ў тэрміналагічных слоўніках 90-х гадоў XX ст.
20. Семантычны спосаб утварэння тэрмінаў.
21. Тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя розных часцін мовы ў тэрміналогіі.
22. Паняцце пра тэрмінаэлемент. Асноўныя адметнасці тэрмінаўтварэння ў параўнанні з агульналітаратурным словаўтварэннем.

Рэпазіторый ВДУ

23. Утварэнне тэрмінаў катэгорыі прадметаў і з'яў.
24. Утварэнне тэрмінаў катэгорыі працэсаў і дзеянняў.
25. Утварэнне тэрмінаў катэгорыі прафесій і сфер дзейнасці.
26. Утварэнне тэрмінаў катэгорыі якасцей і ўласцівасцей.
27. Асноўныя задачы і аспекты ўпарадкавання і нармалізацыі сучаснай беларускай тэрміналогіі розных галін ведаў.
28. Стандартызацыя тэрміналогіі. Адпаведнасць тэрміна моўным нормам.
29. Інтэрнацыяналізацыя і міжнародная уніфікацыя навуковай тэрміналогіі.
30. Вырашэнне праблем унармавання сучаснай беларускай тэрміналогіі: праблемы правапісу і формазмянення.
31. Асаблівасці тэрмінаграфічнай працы ў Беларусі на розных этапах развіцця беларускай мовы.
32. Беларускія энцыклапедычныя і галіновыя слоўнікі, іх характарыстыка.
33. Асноўныя напрамкі сучаснай беларускай тэрмінаграфіі (праектыўная, нарматыўная, апісальная тэрмінаграфія).
34. Камп'ютарныя праблемы беларускай лексікаграфіі і тэрмінаграфіі.

Репозиторий ВГУ

**Узоры тэставых заданняў па дысцыпліне “Асновы тэрміназнаўства”**

1. Вызначце разнавіднасці навуковага стылю:
1) уласна навуковы (акадэмічны)
2) уласна заканадаўчы
3) навукова-вучэбны
4) навукова-папулярны
5) навукова-тэхнічны

2. Назавіце асноўныя разрады спецыяльнай лексікі:
1) дыялектызмы
2) жарганізмы
3) тэрміны
4) наменклатурныя назвы
5) прафесіяналізмы

3. Адзначце, як называюцца словы, што ўжываюцца ў гутарковай мове людзей, аб’яднаных сумесным заняткам, агульнымі інтарэсамі:
1) тэрміны
2) прафесіяналізмы
3) дыялектызмы
4) жарганізмы
5) варварызмы

4. Адзначце, як называюцца словы і спалучэнні слоў, што выкарыстоўваюцца пераважна колам людзей пэўнай галіны ведаў, спецыяльнасці:
1) спецыяльная лексіка
2) дыялектная лексіка
3) жаргонная лексіка
4) запазычаная лексіка

5. Адзначці асаблівасці, не ўласцівыя тэрмінам:
1) адназначнасць
2) наяўнасць экспрэсіі
3) сістэмнасць
4) наяўнасць дэфініцыі

6. Адзначце, якіх тэрмінаў не бывае:
1) тэрміны – назоўнікі
2) тэрміны – словазлучэнні
3) тэрміны – сказы
4) тэрміны – абрэвіятуры

Репозиторий ВГУ

7. Адзначце, якім спосабам утвораны наступныя тэрміны: *педагагічная запушчанасць, лёгкая атлетыка, закон Фарадэя*:
1) лексіка-семантычны
2) словаскладанне
3) марфемны
4) сінтаксічны
5) запазычванне

8. Адзначце, што такое тэрміналагізацыя:
1) спосаб утварэння тэрмінаў, пры якім слова, што існавала ў літаратурнай мове набывае тэрміналагічнае значэнне
2) пераход тэрмінаў з адной тэрмінасістэмы ў другую
3) страта тэрмінам свайго спецыяльнага значэння
4) запазычванне тэрміна ў беларускую мову з іншай мовы

9. Адзначце, у слоўніках якога тыпу тлумачацца рэаліі і паняцці:
1) тлумачальны
2) перакладны
3) энцыклапедычны
4) арфаграфічны

10. Адзначце, з чаго складаецца слоўнікавы артыкул у тэрміналагічным слоўніку:
1) рэестравае слова
2) граматычныя паметы
3) дэфініцыя
4) стылёвыя паметы
5) этымалагічная даведка

**ЗМЕСТ**

1. Вучэбная праграма “Асновы тэрміназнаўства”……………….
2. Літаратура
3. Практычныя заняткі ………………………………………..
4. Пытанні……………………………………………………
5. Узоры тэставых заданняў……………………………………..

Репозиторий ВГУ